# Секция 7
# ДИСКУССИОННЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСИ

УДК 94(=512.122)(476)

## КАЗАХСКАЯ ДЫЯСПАРА Ў БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАЕ СТАНОВІШЧА

**Александровіч Алена Аляксандраўна**
навуковы супрацоўнік Цэнтра ўсеагульнай гісторыі
і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

Дыяспара з'яўляецца неад'емнай часткай нацыі, захавальнікам яе гісторыі і культурнай спадчыны. Вывучэнне, навуковае асэнсаванне культурных здабыткаў дыяспары, пашырэнне звестак пра яе прадстаўнікоў патрэбна кожнай грамадскасці.

Свой уклад у развіццё ўзаемасувязяў паміж Беларуссю і Казахстанам уносіць казахская дыяспара. Невялікая па колькасці, у Беларусі яна з'явілася параўнальна нядаўна, у сярэдзіне XX ст. У гады Вялікай Айчыннай вайны прадстаўнікі казахстанскага народа гераічна праявілі сябе ў многіх бітвах на беларускай зямлі: у абароне Брэсцкай крэпасці, у партызанскай і падпольнай барацьбе, у баях за вызваленне Мінска, Магілёва. У пасляваенны час казахскія спецыялісты прамысловасці, адукацыі, аховы здароўя, культуры актыўна ўдзельнічалі ў аднаўленні беларускіх прамысловых цэнтраў і гарадоў. Асноўную ж частку сучаснай казахскай дыяспары ў Беларусі складаюць тыя, хто яшчэ ў гады Савецкага Саюза прыехаў сюды вучыцца, служыць у арміі або працаваць.

Згодна перапісу насельніцтва 2009 г. на тэрыторыі Беларусі пражывала 1355 казаха [1]. Беларускія казахі жывуць як у буйных гарадах – Мінску, Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве, так і ў Клімавічах, Лідзе, Слоніме, Барысаве, Ганцавічах, Баранавічах.

Упершыню грамадскае аб'яднанне казахі, якія пражываюць у Беларусі, стварылі ў 1999 г. Яно называлася Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Елімай» («Айчына»), якое аб'ядноўвала не толькі этнічных казахаў, але і казахстанцаў розных нацыянальнасцяў. У 2004 г. «Елімай» быў пераўтворана ў Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Ата-мекен» («Бацькоўскі край»). У жніўні 2015 г. з'явілася абласное аддзяленне «Ата-мекен» у Гродна. Пры грамадскай арганізацыі дзейнічаюць перасоўная выстава-музей «Ашак», ансамбль «Салтанат» і дзіцячы танцавальны калектыў «Карлыгаш», які з'яўляецца лаўрэатам беларускіх і казахстанскіх фестываляў нацыянальных культур.

Канструктыўнае супрацоўніцтва МГА «Ата-мекен» наладзіла з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі, у тым ліку Беларускім «Домам дружбы», музеямі імя Я. Купалы, імя Я. Коласа, Вялікай Айчыннай вайны, сярэдняй школай імя М. Аўэзава ў г. Мінску, Пасольствам Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь, прадстаўнікамі прэсы, тэлебачання і радыёвяшчання Беларусі і Казахстана.

З боку дзяржавы, мясцовых органаў улады і Пасольства Казахстана ў Рэспубліцы Беларусь казахскай дыяспары аказваецца практычная дапамога ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Так, з 2009 г. па 2015 г. апаратам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў былі выдзелены сродкі для пашыву 25 жаночых, 4 мужчынскіх нацыянальных касцюмаў, абутку і футляраў для адзення. З мэтай развіцця дзейнасці калектываў мастацкай самадзейнасці ў 2011 г. Пасольствам Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь было перададзена ў дар 11 казахскіх нацыянальных касцюмаў. У 2013 і 2015 г. былі выдадзеныя альбомы «Беларусь шматнацыянальная», у якіх былі размешчаны матэрыялы, прысвечаныя рабоце аб'яднання, культуры Казахстана, традыцыям і звычаям казахаў [2].

«Ата-мекен» праводзіць культурна-асветніцкую работу, накіраваную на вывучэнне і прапаганду казахскага літаратурнага, музычнага, харэаграфічнага, выяўленчага мастацтваў, мовы, традыцый і культурных багаццяў казахскага народа. Добрай традыцыяй стаў удзел арганізацыі ў правядзенні розных міжэтнічных фестываляў. Так, на Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур у г. Гродна «Ата-мекен» правёў прэзентацыю казахскага падворка, дзе гучалі песні, выконваліся танцы, прапаноўваліся стравы нацыянальнай кухні, праводзіліся конкурсы, была арганізавана выстава прадметаў казахскай нацыянальнай культуры. Казахскія ўдзельнікі фестывалю атрымалі Дыпломы лаўрэатаў і каштоўныя прызы. У верасні 2015 г. у Дзень горада Мінска перад жыхарамі сталіцы выступіла 18 нацыянальных аб'яднанняў, сярод якіх калектыў «Салтанат» з казахскімі нацыянальнымі песнямі і танцамі. Значную цікавасць выклікаў стэнд пра культуру і побыт казахскага народа, нацыянальныя касцюмы, песні і танцы, якія былі прадстаўлены на XIII Мінскім гарадскім фестывалі нацыянальных культур «Яднанне» ў лістападзе 2015 г.

Варта адзначыць, што для беларускіх казахаў характэрныя змешаныя шлюбы, таму вельмі важна было не страціць этнічныя карані і далучыць маладое пакаленне да вывучэння казахскай мовы і традыцый казахскага народа. З гэтай мэтай у 2009 г. пры Пасольстве Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь была адкрыта нядзельная школа, у якой усе жадаючыя могуць вывучаць казахскую мову, гісторыю і культуру Казахстана. З мая 2012 г. пачаў працаваць Цэнтр казахскай мовы, гісторыі і культуры імя Абая на базе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта (БНТУ).

У верасні 2014 г. прадстаўнікі казахскай дыяспары арганізавалі вечар, прымеркаваны Дню моў народаў Казахстана, у ходзе якога была прадстаўлена тэматычная фотавыстава, відэафільмы аб сучасным Казахстане, конкурсы на веданне дзяржаўнай мовы, гісторыі, культуры і побыту Казахстана. У рамках мерапрыемства ўдзельнікі чыталі вершы аб мове, спявалі песні, гулялі кюі (традыцыйныя казахскія п'есы, якія выконваюцца на домбры або іншых музычных інструментах – заўв. аўтара) і выконвалі нацыянальныя танцы. У лістападзе 2014 г. у рамках тыдня казахскага кіно і кінафестывалю «Лістапад» члены «Ата-мекен» прынялі ўдзел у праглядзе фільма аб Казахстане «Дыялог праз стэп». У снежні 2015 г. на міжнародным дні чытання паэмы «Сымон-музыка», прымеркаваным да дня нараджэння Я. Коласа, члены казахскай дыяспары чыталі ўрыўкі гэтага вядомага твора на казахскай мове. У траўні 2015 г. у Мінску «Ата-мекен» прыняло ўдзел у XIX Міжнароднай спецыялізаванай выставе «СМІ ў Беларусі» на стэндзе «СМІ дыяспар».

Вялікае значэнне ў дзейнасці аб'яднання мела праца і матэрыяльная падтрымка Пасольства Казахстана ў Рэспубліцы Беларусь. Сумеснымі мерапрыемствамі сталі правядзенне Дня Незалежнасці Рэспублікі Казахстан, дзіцячых навагодніх ранішнікаў у будынку «Дома Дружбы», святкаванне Наўрыза – свята вясны, адзінства і адраджэння, літаратурна-музычных вечароў, прысвечаных творчасці казахскіх пісьменнікаў, паэтаў, музыкаў, мастакоў.

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне казахаў у Беларусі прымае ўдзел у розных акцыях, круглых сталах, на прэзентацыях, дыскусіях па актуальных пытаннях. У прыватнасці, у сакавіку 2015 г. у рамках рэспубліканскай акцыі «Тыдзень лесу» сумесна з кіраўнікамі розных нацыянальна-культурных аб'яднанняў члены казахскай дыяспары прынялі ўдзел у пасадцы дрэў у Валожынскім раёне. У траўні 2015 г. члены аб'яднання разам з ветэранамі-казахстанцамі прынялі ўдзел у прэзентацыі кнігі «Перамога адна на ўсіх. Казахстан – Беларусь». У верасні 2015 г. у Цэнтры казахскай мовы, гісторыі і культуры ім.Абая адбыўся круглы стол, удзельнікамі якога сталі дэлегацыя Сусветнай Асацыяцыі казахаў, якая знаходзіцца ў гэты час з візітам у Беларусі, прадстаўнікі казахскай дыяспары, Пасоль-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ства Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь, органаў дзяржаўнага кіравання, навукоўцы і выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў.

Вялікую ўвагу ў сваёй працы «Ата-мекен» надавала пытаннях увекавечання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і падтрымкі ветэранаў. Так, напярэдадні 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў рамках святкавання Дня Перамогі ў маі 2014 г. для ветэранаў-казахстанцаў быў арганізаваны святочны канцэрт. У траўні 2015 г. было арганізавана віншаванне на даму ветэранаў-казахстанцаў Вялікай Айчыннай вайны з Днём Перамогі. Традыцыйным стала для членаў МГА «Ата-мекен» ускладанне кветак да помніка воінам-казахстанцам, якія загінулі пры абароне і вызваленні Беларусі.

Неабходна адзначыць, што клопат аб суайчынніках, што пражываюць за межамі рэспублікі, з'яўляецца адным з найважнейшых элементаў дзяржаўнай палітыкі Казахстана. Так, для рашэння пытанняў культуры, адукацыі і бізнесу ў 1992 г. была створана Сусветная асацыяцыя казахаў, старшынёй якой з'яўляецца Прэзідэнт Н. Назарбаеў. Акрамя таго, у 1995 г. была распрацавана «Дзяржаўная праграма падтрымкі казахскай дыяспары», у 1998 г. падпісаны «Закон аб міграцыі» і іншыя ўрадавыя акты, якія ўстанаўліваюць узаемаадносіны паміж Рэспублікай Казахстан і казахскай дыяспарай.

Для падтрымання сувязяў з замежнымі суайчыннікамі ў Астане рэгулярна праходзіць Сусветны курултай казахаў, у працы якога бяруць удзел прадстаўнікі казахскай арганізацыі Беларусі. Акрамя гэтага, у сталіцы Казахстана штогод збіраюцца прадстаўнікі з 18 краін на Міжнародным фестывалі мастацтваў казахаў, якія пражываюць за мяжой. У траўні 2013 г. творчай групай тэлевізійнага канала «Kazakh TV» у рамках тэлепраекта, які распавядае аб жыцці казахскіх дыяспар, якія пражываюць за мяжой, была падрыхтавана, а пасля паказаная праграма аб казахах, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі.

Варта адзначыць, што прадстаўнікі казахскай дыяспары ў Беларусі наладзілі цесныя кантакты з прадстаўнікамі беларускай дыяспары ў Казахстане. У прыватнасці, напярэдадні другога фестывалю культуры беларусаў свету ў верасні 2014 г. прайшла сустрэча двух дыяспар, у выніку якой удзельнікі абмяняліся падарункамі.

Такім чынам, важную ролю ў развіцці культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі адыгрывае казахская дыяспара ў Беларусі. Сучасныя і высокаадукаваныя беларускія казахі беражліва захоўваюць нацыянальную культуру, абрады і традыцыі. Дзейнасць грамадскага аб'яднання «Ата-мекен» і Цэнтра імя Абая з'яўляецца важнай састаўной часткай эфектыўнага культурнага супрацоўніцтва Беларусі і Казахстана.

ЛІТАРАТУРА


1. Население по национальности и по владению другими языками // Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belstat.gov.by/uploads/file/GU_demogr/5.10-0.pdf. – Дата доступа: 09.11.2016.
2. МОО «Ата-мекен» // Казахская диаспора в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kz-diaspora.by/moo-ata-meken. – Дата доступа: 09.11.2016.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова